# ПАЛАЖЭННЕ
# АБ ВУЧЭБНАЙ БІЗНЕС-КАМПАНІІ
# ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ

Палажэнне аб бізнес-кампаніі ўстановы адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай праграме «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016-2020 гады» ад 23 лютага 2016 г. № 149, Прыкладным Палажэннем аб вучэбнай бізнес-кампаніі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Рэспублікі Беларусь.

## 1.АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1.Бізнес–кампанія ўстановы адукацыі - гэта аб'яднанне па інтарэсах арганізуецца ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі з мэтай развіцця прадпрымальнасці, фарміравання практычных навыкаў прадпрымальніцкай дзейнасці і іншых неабходных для паспяховай самарэалізацыі асобасных якасцяў, здольнасцяў і кампетэнцый навучэнцаў. Дзейнасць бізнес-кампаніі не з'яўляецца прадпрымальніцкай.

1.2. Мэта бізнес-кампаніі:

- развіццё прадпрымальнасці, фарміраванне ў навучэнцаў практычных навыкаў у галіне прадпрымальніцкай дзейнасці, падрыхтоўка да ўсвядомленага прафесійнага самавызначэння.

1.3. Асноўныя задачы бізнес-кампаніі:

- асваенне сутнасці прадпрымальніцкай дзейнасці з дапамогай практыка-арыентаванага навучання;
- садзейнічанне асобасна-прафесійнаму станаўленню і развіццю навучэнцаў;
- рэалізацыя магчымасцяў вытворчасці матэрыяльных і інтэлектуальных прадуктаў.

1.4. Функцыі бізнес-кампаніі:

навучальная: фарміраванне ў навучэнцаў ведаў аб прадпрымальнасці і прадпрымальніцтве і першапачатковых уменняў для прымянення гэтых ведаў у практычнай дзейнасці;

выхаваўчая: выхаванне пачуцця адказнасці за вынікі сваёй працы, стымуляванне матывацыі дасягнення поспеху;

развіваючая: развіццё асобасных якасцяў, здольнасцяў і кампетэнцый, якія забяспечваюць паспяховасць у прадпрымальніцкай дзейнасці;

сацыяльная: развіццё навыкаў арыентавання ў сацыяльна-эканамічным і прававым асяроддзі.

## 2. АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ РАБОТЫ БІЗНЕС-КАМПАНІІ

2.1. Бізнес-кампанія ствараецца і функцыянуе непасрэдна на базе ўстановы адукацыі.

2.2. Бізнес-кампанія арганізуецца на добраахвотнай аснове і зацвярджаецца рашэннем Савета ўстановы адукацыі.

2.3. Змест і асноўныя напрамкі дзейнасці бізнес-кампаніі канкрэтызуюцца зыходзячы са спецыфікі і магчымасцяў установы адукацыі, наяўнай матэрыяльна-тэхнічнай базы, патрэбаў і інтарэсаў яе ўдзельнікаў.

2.4. Абавязковымі ўмовамі стварэння бізнес-кампаніі з'яўляюцца:

наяўнасць загада па ўстанове адукацыі «Аб стварэнні бізнес-кампаніі і прызначэнні куратара»;

рашэнне Савета ўстановы адукацыі аб стварэнні бізнес-кампаніі;

наяўнасць кіраўніка бізнес-кампаніі з ліку педагагічных работнікаў з мэтай выканання кантралюючых функцый і аказання кансультатыўнай дапамогі яе ўдзельнікам;

наяўнасць пісьмовых заяў ад яе ўдзельнікаў;

наяўнасць пісьмовай згоды на ўдзел у бізнес-кампаніі аднаго з законных прадстаўнікоў (бацькі альбо маці, усынавіцеля, апекуна, папячыцеля) кожнага яе ўдзельніка;

наяўнасць зацверджанага кіраўніком установы адукацыі плана дзейнасці бізнес-кампаніі;

выкананне правілаў тэхнікі бяспекі, нормаў і правілаў аховы працы, санітарных і супрацьпажарных правілаў.

2.5. Бізнес-кампанія можа ажыццяўляць дзейнасць па вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцяў і інтэлектуальных прадуктаў (за выключэннем дзейнасці, якая ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам аднесена да ліцэнзійнай).

## 3. УДЗЕЛЬНІКІ БІЗНЕС-КАМПАНІІ

3.1. Удзельнікамі бізнес-кампаніі могуць быць толькі навучэнцы ўстановы адукацыі.

3.2. Удзел у дзейнасці бізнес-кампаніі магчымы толькі ў перыяд навучання ва ўстанове адукацыі, у вольны ад адукацыйнага працэсу час.

3.3. Колькасць удзельнікаў бізнес–кампаніі вызначаецца ў адпаведнасці з артыкулам 233 Кодэкса аб адукацыі: напаўняльнасць аб'яднання па інтарэсах першага года навучання складае ад 12 да 15 навучэнцаў, другога і наступных гадоў навучання – не менш за 8 навучэнцаў.

3.4. Удзельнікі бізнес-кампаніі самастойна выбіраюць кіраўніка і іншыя органы кіравання большасцю галасоў.

3.5. Куратар бізнес-кампаніі не з'яўляецца яе ўдзельнікам.

## 4. КІРАЎНІЦТВА ДЗЕЙНСЦЮ БІЗНЕС-КАМПАНІІ

4.1. Кіраўнік установы адукацыі:

ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю бізнес-кампаніі;

арганізуе ўзаемадзеянне з упраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Вілейскага райвыканкама па пытаннях рэгламентацыі дзейнасці бізнес-кампаніі;

заключае дамовы ад імя ўстановы адукацыі на рэалізацыю выробленых матэрыяльных каштоўнасцяў і інтэлектуальных прадуктаў.

4.5. Упраўленне па адукацыі, спорце і турызме Вілейскага райвыканкама забяспечвае вядзенне рэестра бізнес-кампаніі, арганізацыю і правядзенне раённых, абласных форумаў, злётаў, кірмашоў.

4.6. Кансультатыўную дапамогу, накіраваную на аптымізацыю дзейнасці бізнес-кампаніі, могуць аказваць суб'екты інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

4.7. Дзейнасць бізнес-кампаніі прыпыняецца альбо спыняецца рашэннем кіраўніцтва ўстановы адукацыі ў сувязі з:

заканчэннем бягучага навучальнага года, да пачатку наступнага навучальнага года;

неадпаведнасцю дзейнасці бізнес-кампаніі зацверджанай бізнес-стратэгіі;

адсутнасцю дзейнасці бізнес-кампаніі на працягу вучэбнай чвэрці.

4.8. Дзейнасць бізнес-кампаніі можа працягвацца ў перыяд летніх канікул у адпаведнасці з рашэннем педагагічнага савета ўстановы адукацыі і загадам кіраўніка ўстановы адукацыі.

## 5. АХОВА ПРАЦЫ

5.1. Удзельнікі бізнес-кампаніі праходзяць навучанне па ахове працы ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства ў дадзеным напрамку. Навучанне праводзіцца кіраўніком бізнес-кампаніі.

5.2. Удзельнікі бізнес-кампаніі дапускаюцца да працы толькі пасля праверкі іх ведаў па правілах бяспечных паводзін, складаецца пратакол праверкі ведаў.

5.3. Падчас выканання работ, удзельнікі бізнес-кампаніі павінны кіравацца патрабаваннямі па ахове працы, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам.

5.4.Педагагічныя работнікі ажыццяўляюць кантроль за выкананнем патрабаванняў бяспекі, санітарна-гігіенічных норм,

пажарнай і радыяцыйнай бяспекі ў адпаведнасці з дзеючымі нарматыўнымі прававымі актамі.

## 6. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ БІЗНЕС–КАМПАНІІ

6.1.Удзельнікі бізнес-кампаніі маюць права:

абіраць і быць выбранымі ў кіраўніцтва бізнес-кампаніі;

удзельнічаць у вызначэнні напрамкаў дзейнасці бізнес-кампаніі;

атрымліваць інфармацыйную, кансультацыйную падтрымку з боку куратара бізнес-кампаніі;

удзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца бізнес–кампаніяй;

выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы ўстановы адукацыі для дзейнасці бізнес-кампаніі;

спыніць свой удзел у дзейнасці бізнес-кампаніі.

6.2. Удзельнікі бізнес-кампаніі абавязаны:

добрасумленна выконваць абавязкі, патрабаванні вучэбнай і працоўнай дысцыпліны;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў бізнес-кампаніі;

клапаціцца аб захаванасці маёмасці, інвентара і памяшканняў, якія прадастаўляюцца ўстановай адукацыі для дзейнасці бізнес-кампаніі.

## 7. УЛІК І АПЛАТА ПРАЦЫ

7.1. Рэалізацыя выраблenага бізнес-кампаніяй прадукту ажыццяўляецца за наяўны або безнаяўны разлік членамі бізнес-кампаніі ў рамках дзеючага заканадаўства (кірмашу, выставы па дагаворах паміж установамі адукацыі і гандлёвымі арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, альбо з іншымі арганізацыямі, зацікаўленымі ў атрыманні дадзенага прадукту);

7.2. Грашовыя сродкі, атрыманыя за рэалізацыю гатовай прадукцыі, паступаюць на пазабюджэтны разліковы рахунак установы адукацыі. Нарматыў размеркавання дадзенага даходу завярджаецца загадам дырэктара ўстановы адукацыі па трох напрамках:

патрэбы ўстановы адукацыі;

забеспячэнне дзейнасці самой бізнес-кампаніі (набыццё матэрыялаў, абсталявання і т.п.);

заахвочванне удзельнікаў бізнес-кампаніі.

Заахвочванне кіраўніка з ліку педагагічных работнікаў ажыццяўляецца з часткі прыбытку, якая накіроўваецца на патрэбы ўстановы адукацыі.

7.3. Па завяршэнні навучальнага года кіраўніцтва бізнес-кампаніі пры садзейнічанні куратара рыхтуе справаздачу аб дзейнасці кампаніі і прадстаўляе яе адміністрацыі ўстановы адукацыі на зацвярджэнне.